# СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!




**НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, ЗА МІР, ДЭМАКРАТЫЮ І САЦЫЯЛІЗМ!**

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ, ВЫШЫНЯМІ НАВУКІ І ТЭХНІКІ! БУДЗЬЦЕ ВЕРНЫМІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ІДЭАЛАМ, АКТЫЎНЫМІ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ БУДАЎНІЦТВА КАМУНІЗМА!**

*(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 1 МАЯ 1969 ГОДА).*

## УРАЧЫСТЫ СХОД




Дзевяноста дзевятая гадавіна з дня нараджэння вялікага правадыра працоўных усяго свету Уладзіміра Ільіча Леніна шырока адзначана ва універсітэце. У групах, на курсах, на факультэтах адбыліся гутаркі, ленінскія чытанні, прайшлі тэарэтычныя канферэнцыі, выйшлі спецыяльныя выпускі насценных газет.

На ўрачысты сход, прысвечаны знамянальнай даце, сабралася паўтары тысячы студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. З вялікай зацікаўленасцю і адкрытым сэрцам яны слухалі палымяныя словы аб геніяльным і простым чалавеку, нашым Уладзіміру Ільічу.

Даклад прафесара Анатоля Яфімавіча Журава зрабіў глыбокае ўражанне, пазнаёміў з хвалюючымі старонкамі вялікага ленінскага жыцця.

У заключэнне прысутныя прагледзелі кінафільм «Сіні сшытак».

**В. АРЭХАЎ.**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 15 (744) ✦ Аўторак, 29 красавіка 1969 г. Цана 2 кап. Год выдання XXII

# МАЙСКІ НАСТРОЙ ПАЎСЮДНА

**Кожны год Першамай прыходзіць да нас з цудоўным вясеннім настроем, з творчым натхненнем, з неабдымнай чалавечай радасцю. Здавалася б, у гэтыя дні універсітэт жыве самымі звычайнымі клопатамі— першакурснікі рыхтуюцца да сесіі, выпускнікі заканчваюць дыпломныя, а выкладчыкі абараняюць кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, камплектуюцца баявыя атрады на цаліну, праводзяцца канферэнцыі чытачоў, выступаюць самадзейныя артысты. Але паглядзіце, з якім уздымам усё гэта праходзіць!**

**Сёлета Першамай крочыць па нашай краіне, калі савецкі народ разам з усім прагрэсіўным чалавецтвам рыхтуецца да ўрачыстага юбілею — 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Пад сцягам дастойнай сустрэчы ленінскага юбілею вітае першамайскае свята і наш універсітэт. Гэта бачна па ўсім. З поспехам выконваюцца ўзятыя сацыялістычныя абавязацельствы. Студэнты імкнуцца ў час вясенняй сесіі паказаць добрыя і выдатныя вынікі на экзаменах, пашыраюць свой удзел у грамадскай рабоце. Камсамольцы універсітэта трэці працоўны семестр 1969 года ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна аб'явілі ўдарным.**

**З поспехам прайшла нядаўна ў БДУ рэспубліканская навуковая канферэнцыя прафесараў і выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў БССР, прысвечаная 60-годдзю з дня выхаду кнігі У. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Шматлікія канферэнцыі чытачоў і ленінскія чытанні прайшлі на факультэтах. Адбылася традыцыйная студэнцкая навуковая канферэнцыя. У гэтых мерапрыемствах студэнты і выкладчыкі прымаюць самы актыўны ўдзел. Яны робяць цікавыя даклады, горача выступаюць у спрэчках па самых разнастайных і актуальных пытаннях. Прайшлі цікавыя сустрэчы са знатнымі людзьмі рэспублікі і краіны ў інтэрнатах універсітэта.**

**Як звычайна, у перадмайскія дні ва універсітэце бывае многа гасцей. Пацікавіцца нашым жыццём прыязджаюць людзі з самых розных рэспублік і краін народнай дэмакратыі. У сваю чаргу і студэнцкай моладзі нашага універсітэта не сядзіцца ў родных сценах. Толькі што вярнулася з фестывалю дружбы, які праходзіў у Харкаве, вялікая група ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, камсамольскіх актывістаў. На сустрэчы прадстаўнікоў вну, якія носяць імя У. І. Леніна, у Дагестане пабывала дэлегацыя нашага універсітэта.**

**1 Мая разам з усімі працоўнымі Мінска універсітэцкі калектыў прадэманструе сваю адданасць партыі, народу, сваё гарачае імкненне высока несці сцяг флагмана беларускай навукі.**

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПЕСНІ РАДКІ

### СУСТРЭЧЫ СЯБРОЎ

**Перадмайскія дні для нашага універсітэта былі асабліва багатымі на гасцей. У нас пабывалі дэлегацыі вучоных і грамадскіх дзеячоў з многіх краін свету. Пашырылася і студэнцкае сяброўства.**

**Прадстаўнікі далёкай Грузіі некальні дзён правялі разам са студэнтамі гістфака і запрасілі іх да сябе ў госці.**

**А вось цэлая група студэнтаў з Латвіі дасканала азнаёмілася са справамі і жыццём маладзёжнага калектыву нашага універсітэта. Латвійскія камсамольскія актывісты пабывалі на факультэтах, у музеях, лабараторыях. Іх асабліва цікавіла выхаваўчая работа. Што ж, беларусы з ахвотай падзяліліся вопытам. Аб новых формах прапаганды і агітацыі, народжаных у час падрыхтоўкі да 50-годдзя рэспублікі і КПБ, да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, ім падрабязна расказалі члены бюро камітэта камсамола, актывісты з факультэтаў. Вялікая размова па гэтых пытаннях адбылася ў партыйным камітэце, дзе быў наладжан урачысты прыём.**

**Універсітэт арганізаваў вялікую экскурсію па гораду Мінску, а таксама ў Трасцянец і іншыя памятныя мясціны вакол сталіцы Беларусі. Універсітэцкія камсамольцы запрасілі сваіх сяброў у Дом афіцэраў на традыцыйны вечар па тэме «Вялікі Ленін на подзвігі нас натхняе». Госці засталіся вельмі задаволеныя сустрэчай з воінамі Беларускай акругі і сталічнымі студэнтамі. Яны запэўнілі, што вопыт студэнтаў БДУ, політэхнічнага і іншых інстытутаў Мінска па арганізацыі сумесных з воінамі мерапрыемстваў патрыятычна-выхаваўчага характару імі будзе шырока выкарыстан у Латвіі.**

**К. ПЯТРОВА.**

### УЗНАГАРОДА ЗА ПЕРАМОГУ

На гістарычным факультэце добра ведаюць юнакоў і дзяўчат з трэцяга курса філасофскага аддзялення. Яны і добра вучацца, і актыўна ўдзельнічаюць у спартыўным і культурным жыцці універсітэта, іх важкае слова гучыць на ўсіх студэнцкіх тэарэтычных канферэнцыях. Актыўнасць групы асабліва праявілася, калі на факультэце было аб'яўлена спаборніцтва за дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Кожны імкнуўся прынесці калектыву як мага больш заліковых ачкоў.

Нядаўна былі падведзены вынікі. Аказалася, што першае месца сярод акадэмічных груп гістфака заняў трэці курс філасофаў з сярэднім балам 4,47. Прайшоў некаторы час, і стала вядома, што гэтая ж група выйшла пераможцай і ў агульнауніверсітэцкім спаборніцтве. У ёй амаль палова — выдатнікі. Гэта ленінскі стыпендыят Юра Шынкар, Галя Санюк, Міша Вінніկаў, Тадэуш Адула, Валодзя Кузьмінаў і іншыя. Пераможцы групы садзейнічалі і аматары мастацкай самадзейнасці, спартсмены, лектары.

Днямі пераможцы выехалі ў Ерэванскі універсітэт. Яны заваявалі гэта права стараннай вучобай, актыўнасцю ў грамадскім жыцці. Студэнты пабываюць таксама ў Тбілісі, Сухумі і іншых гарадах. Дададзім, што камсоргам групы з'яўляецца Ларыса Жывадрова, старастай — Федзя Лазюк, куратарам—кандыдат філасофскіх навук дацэнт С. Д. Лапцёнак.

**І. СІБІРСКІ.**

### ГОСЦЯ З БАЛГАРЫІ

**На канферэнцыю, прысвечаную 60-годдзю з дня выхаду кнігі Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм», наш універсітэт запрасіў гасцей з вышэйшых навучальных і даследчых устаноў краін народнай дэмакратыі. Супрацоўнікі кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі цёпла, па-братэрску прынялі старшага выкладчыка Сафійскага універсітэта кандыдата філасофскіх навук Іванку Апосталаву. Яна прыняла актыўны ўдзел у рабоце канферэнцыі, выступіла з цікавым дакладам на секцыі філасофскіх пытанняў прыродазнаўства.**

**Кафедра наладзіла прыём балгарскай госці. Гаспадары падрабязна расказалі аб сваёй рабоце — поспехах і сакрэтах падрыхтоўкі студэнтаў па марксісцка-ленінскай філасофіі, дасягненнях у навуковых даследаваннях. Іванку Апосталаву зацікавіў таксама вопыт ідэйна-палітычнай работы кафедры.**

**У заключэнне госця расказала аб пастаноўцы выкладання філасофскіх дысцыплін у Сафійскім універсітэце, аб актыўным удзеле філосафаў Балгарыі ў барацьбе супраць буржуазнай ідэалогіі, сардэчна падзякавала за цёплую сустрэчу.**

**Іванка Апосталава выступіла таксама перад студэнтамі філасофскага аддзялення. А. БЯРОЗАЎ.**



### МОВАЙ ЛЕНІНА

*Напярэдадні свята салідарнасці кафедра рускай мовы падрыхтоўчага факультэта правяла вечар «Мы размаўляем і спяваем па-руску», на якім студэнты многіх вучэбных груп чыталі на рускай мове вершы, апавяданні, байкі, спявалі песні.*

*Большасць з уключаных у праграму канцэрта твораў была прысвечана У. І. Леніну.*

# ЖЫЦЬ, ПРАЦАВАЦЬ,



Студэнты чацвёртага курса аддзялення радыёфізікі на практычных занятках у антэннай лабараторыі.

Фота Я. Данілава.

## СВЕТАЧ НЯЗГАСНЫ

На працягу трох дзён у нашым універсітэце праходзіла рэспубліканская навуковая канферэнцыя прафесараў і выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў БССР, прысвечаная 60-годдзю з дня выхаду кнігі У. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». На пленарным пасяджэнні і на пасяджэннях секцый дыялектычнага матэрыялізму, філасофскіх пытанняў прыродазнаўства, гісторыі філасофіі і гістарычнага матэрыялізму было прачытана і абмеркавана 36 дакладаў.

**У выступленнях вучоных універсітэта, інстытутаў Мінска, Гомеля, Магілёва, Гродна, Віцебска і іншых гарадоў рэспублікі быў дадзен глыбокі аналіз бессмяротных ідэй ленінскага твора, паказана яго роля у развіцці ўсіх навук у Савецкім Саюзе. Многія даклады былі прысвечаны ленінскай крытыцы ідэалізму, пазітывісцкіх плыняў буржуазнай філасофіі і, што асабліва важна, канферэнцыя сканцэнтравала сваю ўвагу на сучасных актуальных пытаннях навукі.**

**Канферэнцыя падвяла вынікі шматграннай работы беларускіх філосафаў, гісторыкаў і прадстаўнікоў іншых грамадскіх навук па прапагандзе і вывучэнню «Матэрыялізму і эмпірыякрытыцызму» У. І. Леніна. Дарэчы, па гэтаму пытанню быў асобны даклад. Ленінскі твор у Беларусі стаў вядомы хутка пасля яго выхаду ў свет, яго прапаганда прыняла асабліва шырокі размах пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі. Беларускія даследчыкі ўнеслі значны ўклад у распрацоўку праблем, сфармуляваных У. І. Леніным.**

**Удзельнікі канферэнцыі вырашылі ператварыць такія сустрэчы па ленінскай філасофскай спадчыне у традыцыйныя, штогадовыя.**

**Б. КАРПОВІЧ.**

## У СЭРЦЫ КОЖНАГА В'ЕТНАМЦА

Калі я быў маленькім, часта чуў, як другія вымаўляюць імя Ленін. Аднойчы я запытаў маіх бацькоў: «Хто такі Ленін?» Мой бацька ўсміхнуўся і сказаў:

— Самая светлая зорка ў небе — гэта Ленін. Ленін — гэта сапраўдны чалавек. Ленін — гэта правадыр усяго свету, гэта геній нашай эпохі. Ён указаў чалавецтву дарогу да свабоды і шчасця.

У школе я болей даведаўся аб У. І. Леніне. Я навучыўся чытаць і пісаць і ўжо самастойна даведаўся аб Леніне з кніг, якія выдаваліся ў В'етнаме. Я вельмі любіў чытаць аб дзіцячых і юнацкіх гадах Валодзі Ульянава. Пазней пачаў цікавіцца і рэвалюцыйнай дзейнасцю Ільіча.

Ленін аддаў усе свае сілы радзіме і народу. Роля Леніна вельмі вялікая ў гісторыі чалавецтва. Ленін вучыў пралетарыят змагацца супраць эксплуатацыі, супраць нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту, за свабоду і шчасце людзей на зямлі. Ён быў вялікім гуманістам, які прысвяціў усё сваё жыццё барацьбе за лепшае будучае чалавецтва. Само жыццё яго — жывое ўвасабленне гэтай рэвалюцыйнай барацьбы.

І ў той жа час ва ўсім свеце ведаюць Ільіча як самага сціплага, простага чалавека.

Ленін набыў бессмяротнасць.

«Ленин
и теперь
живее всех живых—
Наше знанье,
сила
и оружие!»

Так пісаў савецкі паэт У. У. Маякоўскі. Так, Ленін жыве сёння ў сэрцы кожнага в'етнамца, у гераічнай барацьбе в'етнамскага народа супраць амерыканскіх імперыялістаў. Справу Леніна працягвае савецкі народ пад кіраўніцтвам ленінскай партыі. Пад сцяг марксізма-ленінізма сталі і іншыя народы свету.

Мы можам сёння сказаць словамі песні: «В каждом деле Ленин с нами!».

**Фам Хыу Ты,**
**студэнт падрыхтоўчага факультэта.**



## ВЕРНАСЦЬ ПРЫЗВАННЮ

Многа прыемных слоў і віншаванняў было адрасавана ў гэтыя дні дэкану юрыдычнага факультэта Васілю Адамавічу Шкурко.

Выкладчыцкі і студэнцкі калектывы павіншавалі педагога і вучонага з 50-гадовым юбілеем і 25-годдзем навуковай дзейнасці.

Пачаўшы працоўны шлях сельскім настаўнікам, Васіль Адамавіч і ў далейшым захаваў вернасць педагагічнаму прызванню. Толькі ў суровыя гады вайны настаўнік стаў салдатам і са зброяй у руках адважна абараняў Радзіму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

А затым — выдатная вучоба на юрыдычным факультэце Ленінградскага універсітэта, аспірантура і накіраванне на работу ў Іркуцкі універсітэт. Новыя гарызонты адкрыла цікавая работа са студэнтамі.

З 1962 года Васіль Адамавіч звязвае свой лёс з нашым універсітэтам. Шматгранная і плённая яго педагагічная, навуковая і грамадская дзейнасць. Ён умела прывівае студэнтам цікавасць да навукова-даследчай работы, сам паказвае прыклад творчага падыходу да праблем навукі: у актыве Васіля Адамавіча — больш 20 навуковых работ. Ён удзельнік многіх грамадскіх камісій, нарад, арганізацый, дзе знаходзяць прымяненне яго веды. А ў калектыве факультэта паважаюць Васіля Адамавіча яшчэ і за яго прынцыповасць, чулыя адносіны да патрэб супрацоўнікаў і студэнтаў.

А. АЛЕНІЧ.

## ЛЕНІНСКІ СТЫПЕНДЫЯТ

Калі я думаю пра Уладзіміра Лахаданава, успамінаецца вераснёўскі вечар 1965 года. Па традыцыі 3 верасня ўзнаўляе работу шашачны клуб БДУ. Валодзя толькі што пераступіў парог універсітэта. Пасля заканчэння з залатым медалем сярэдняй школы № 1 горада Горкі Магілёўскай вобласці ён бліскуча вытрымаў уступныя экзамены ва універсітэт і стаў студэнтам матэматычнага факультэта.

І вось ён перада мной. Юны матэматык хоча паспрабаваць свае сілы ў шашках. У школьныя гады ён аддаваў ім увесь свой вольны час, але сапернікамі яго былі толькі такія ж аматары, як і ён. Цяпер можна выпрабаваць сябе ў паядынках з майстрамі. І Валодзя робіць выклік... мне. Адмаўляцца няёмка. Думаю, хутка выйграю, а пасля буду суцяшаць, што дасягнуць шашачнага майстэрства—не поле перайсці.

Але мяне чакаў сюрпрыз. Першая партыя — нічыя, другая — таксама, трэцюю прайграю, пасля—некалькі нічыіх, і толькі ў восьмай я адыгрываюся. Бачу, што Валодзя—вялікі талент. Вырашыў выпрабаваць яго ў сустрэчах з майстрамі, тым больш, што на днях пачыналася першынство Беларусі па маланкавай гульні ў шашкі.

Валодзю дапусцілі ў паўфінал, і ён без асаблівых намаганняў стаў фіналістам. Адзіны трэцяразраднік сярод майстроў!

А вось і фінал. Адбылося тое, аб чым нават марыць нельга. Валодзя падзяляе першае-другое месцы з майстрам Я. Гандліным, заваёўвае свой першы залаты медаль і прыз (будзільнік для студэнта-першакурсніка арганізатары лічылі проста неабходным). Яму прысвоілі адразу першы разрад.

У наступным спаборніцтве ён ужо становіцца кандыдатам у майстры. І поспехі ішлі адзін за другім.

Фрунзе, Томск, Севастопаль, Казань — вось гарады, дзе паспяхова выступаў Валодзя. Але прысвяціць спорту ўвесь час ён, вядома, не мог. Студэнт павінен у першую чаргу вучыцца. І вучыцца выдатна. У заліковай кніжцы ў яго адны пяцёркі, ён—ленінскі стыпендыят.

Я вёў заняткі ў групе, дзе вучыўся Валодзя, і ведаю яго акуратнасць, яго вялікія здольнасці.

Таварышы ацанілі не толькі яго навуковыя поспехі, але і арганізатарскія здольнасці і выбралі ў мінулым годзе старшынёй прафбюро матэматычнага факультэта. А гэта пасада, мабыць, самая клапатлівая.

Днямі закончылася студэнцкае першынство рэспублікі па міжнародных шашках—тры тыдні ўпартых паядынкаў. Бліскуча стартаваў у чэмпіянаце Уладзімір. Ужо за пяць тураў да фінішу ён упершыню выканаў майстэрскі нарматыў. Такога ў практыцы шашачных спаборніцтваў не было. А колькі цікавых, самабытных партый даў ён! І калі б у яго была магчымасць удзяляць дастаткова часу шашкам, ён ужо мабыць быў бы гросмайстрам. Даводзіцца толькі здзіўляцца яго таленту, яго ўменню і выдатна вучыцца, і выдатна іграць у шашкі, і быць выдатным актывістам. А да таго ж Валодзя яшчэ і вялікі фотааматар, заўзяты рыбалоў-паляўнічы, любіць тэатр, кіно. Нават я, добра ведаючы яго, здзіўляюся: дзе ж узяць столькі часу? А на маё пытанне Валодзя толькі ўсміхаецца: яму вядома, якім можа быць адказ. Гэта—яго рэжым

А яго планы? Аб гэтым ён гаворыць коратка. Закончыць універсітэт і... навука, навука. А час адпачынку ён будзе прысвячаць шашкам, грамадскай рабоце, фотасправе, рыбнай лоўлі, паляванню і яшчэ многім цікавым заняткам.

**Г. ДРАБУШЭВІЧ,**
**ст. выкладчык кафедры вылічальнай матэматыкі, заслужаны трэнер БССР.**

**На здымку:** У. Лахаданаў у час паядынку з гросмайстрам А. Гантваргам.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**




## ГАРЫЗОНТЫ

**Поўнае і шматграннае жыццё універсітэцкага калектыву. Ён ажыццяўляе на практыцы рашэнні партыі і ўрада, настойліва ўдасканальвае навучальны працэс і навукова-даследчую работу, актыўна ўдзельнічае ва ўсіх палітычных кампаніях.**

**Партыйныя арганізацыі, абапіраючыся на прафсаюзны і камсамольскі актыў выкладчыкаў і шырокую грамадскасць, імкнуцца выхаваць у кожнага студэнта, рабочага і служачага універсітэта ідэйную перакананасць, высокую палітычную свядомасць, камуністычныя адносіны да працы, вучобы, дзяржаўнай маёмасці. Вынікі гэтай работы відавочны. Ва універсітэце склаліся здаровыя, прынцыповыя, дзелавыя абставіны, якія садзейнічаюць паспяховаму навучанню і выхаванню студэнтаў, развіццю навукі.**

**Аднак жыццё пастаянна вылучае новыя праблемы і задачы і патрабуе апаратыўнага і ўмелага іх рашэння. Вось чаму на чарговым агульным сходзе камуністаў універсітэта абмеркавана наспеўшае пытанне аб становішчы і мерах па далейшаму паляпшэнню ідэалагічнай работы.**

**Дакладчык, член парткома, дэкан падрыхтоўчага факультэта М. К. Гарбачоў глыбока аргументаваў пастаноўку данага пытання на партыйным сходзе. Ён падкрэсліў неабходнасць далейшага узмацнення барацьбы з пранікненнем буржуазнай ідэалогіі, мэтанакіраванай палітычнай загартоўкі студэнцтва. М. К. Гарбачоў адзначыў у той жа час недахопы ў ідэалагічнай рабоце, вынікам якіх былі факты абыякавых адносін да работы і грамадскіх даручэнняў, парушэння дысцыпліны. Так, на зімовую сесію без уважлівых прычын не з'явіліся 194 студэнты, а з усіх здаваўшых экзамены і залікі 927 студэнтаў, або 13 працэнтаў, атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Амаль 40 працэнтаў студэнтаў вучыцца толькі на здавальняюча. Панізілася паспяховасць у параўнанні з зімовым семестрам мінулага года на хімічным і**

# СЯРЭБРАНЫ ЮБІЛЕЙ

## Факультэту журналістыкі — 25 год • Сардэчныя пажаданні • 1100 вострых пер'яў • Спакой ім толькі сніцца



## ВІНШУЕМ БАЙЦОЎ ПЯРА

**Чвэрць стагоддзя рыхтуе факультэт журналістыкі нашага універсітэта верных памочнікаў партыі — сапраўдных байцоў пяра. Выпускнікі журфака паспяхова працуюць у Беларусі і далёка за яе межамі, многія з іх узначальваюць рэспубліканскія, абласныя і раённыя газеты, кіруюць выдавецтвамі. Яны пачэсна выконваюць абавязкі прапагандыстаў, агітатараў і арганізатараў.**

**Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, камітэт камсамола і прафком сардэчна віншуюць выкладчыкаў, аспірантаў, супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта журналістыкі з юбілеем і жадаюць ім новых творчых поспехаў у працы, вучобе, выхаваўчай рабоце, шчасця ў асабістым жыцці. І далей высока нясіце гонар ардэнаноснага універсітэта — флагмана беларускай навукі і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў!**

Мне хочацца ў дзень слаўнага юбілею факультэта выказаць яму сваю сардэчную ўдзячнасць, павіншаваць прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў з вялікім святам і пажадаць ім вялікіх поспехаў у працы, вучобе, жыцці.

**І. НОВІКАЎ,**
**загадчык карэспандэнцкага пункта «Правды» па БССР.**

*Я на ўсё жыццё захаваю глыбокую ўдзячнасць да «альма-матэр», да педагогаў, якія заўсёды акцэнтавалі нашу ўвагу на ўменні, на мастацтве «бачыць жыццё».*

*Н. МАТУКОЎСКІ,*
*уласны карэспандэнт «Известий», былы выпускнік БДУ.*

Ад душы жадаю тым, хто сёння грызе «граніт навукі», авалодвае вельмі складаным, але і вельмі захапляючым мастацтвам журналістыкі, поспехаў у вучобе і творчых перамог.

*А. ЗІНІН,*
*рэдактар газеты «Советская Белоруссия».*

**Мне хацелася б павіншаваць наш журналісцкі факультэт, з яго дваццаціпяцігоддзем. Гэтыя віншаванні шле ўвесь калектыў «Знамени юности», які прадстаўляе ў сваёй аснове выхаванцаў універсітэта.**

**В. ЧАНІН,**
**рэдактар газеты «Знамя юности».**



## ГАЗЕТА ВЫХОДЗІЦЬ ЗАЎТРА

...10 гадзін вечара. Паволі пусцеюць аўдыторыі, у калідорах сціхае шум. Толькі ў кабінеце друку кіпіць работа. Над вялікім аркушам паперы схіліўся Эрык Шур. Думае зараз рэдактар, як лепш змакеціраваць чарговы нумар «Журналіста». На дапамогу прыходзяць члены рэдкалегіі Уладзімір Трусаў і Таня Кацнельсон. Пішучая машынка ажывае — і чорныя радкі адзін за другім пабеглі па паперы. Іна Клыга спяшаецца. Па графіку газета выходзіць заўтра.

Яшчэ некалькі хвілін, і калонкі «Журналіста» якія па плошчы займаюць два развароты любой цэнтральнай газеты звярстаны. Застаецца толькі кожны матэрыял перадрукаваць на машынцы, паставіць на сваё месца і маляўніча аформіць. Гэта ўжо работа мастакоў Тані Кацнельсон і Валодзі Трусава.

Нарэшце, усё гатова.

...Выйшаў чарговы нумар «Журналіста».

**Я. СЯРЭДЗІЧ.**



## КУЗНЯ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ

Факультэт журналістыкі ў нашым універсітэце быў створан у 1944 годзе.

За гады існавання факультэта (аддзялення) зроблен 21 выпуск журналістаў, яго скончыла 1100 чалавек. Гэта вялікая армія друку, радыё, тэлебачання і выдавецтваў. Былыя выпускнікі факультэта цяпер працуюць рэдактарамі рэспубліканскіх і раённых газет, узначальваюць аддзелы выдавецтваў, рэдакцый радыё і тэлебачання. Іх можна сустрэць на халоднай Поўначы і гарачым Поўдні, у ГДР і Венгрыі. Многія з іх трымаюць сувязь з факультэтамі: пішуць пісьмы, дзеляцца ўражаннямі, даюць парады.

Значная частка паэтаў і пісьменнікаў нашай рэспублікі — выпускнікі факультэта журналістыкі. Сярод іх Мікола Аўрамчык, Іван Новікаў, Георгій Шыловіч, Міхась Стральцоў, Іван Чыгрынаў, Іван Пташнікаў, Васіль Зуёнак, Галіна Васілеўская, Ольга Сіманава і іншыя.

Добрыя характарыстыкі даюць нашым выпускнікам рэдакцыі газет, радыё, тэлебачання, выдавецтваў. Рыхтуючыся да 25-годдзя факультэта, мы прасілі рэдакцыі даць кароткія характарыстыкі на нашых выпускнікоў. Характарыстык атрымана намі многа, і ўсе яны станоўчыя.

З году ў год наш факультэт рос, мацнеў. Калі пяць год назад на факультэце была адна кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку, у веданні якой былі ўсе журналісцкія дысцыпліны, то цяпер мы маем тры кафедры: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, радыёвяшчання і тэлебачання. Але падрыхтоўка кадраў журналістаў ажыццяўляецца не толькі сіламі трох кафедр. У агульнай падрыхтоўцы будучых работнікаў друку, радыё і тэлебачання вялікую ролю адыгрываюць і агульнауніверсітэцкія кафедры.

У даваенны час у рэспубліцы амаль адсутнічала навукова-даследчая работа у галіне гісторыі, тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку Беларусі, не вывучалася публіцыстычная спадчына У. І. Леніна і публіцыстаў ленінскай школы, не было даследаванняў у галіне беларускай стылістыкі. У пасляваенны час, асабліва за апошнія пяць-шэсць год, выкладчыкі факультэта выпусцілі ў свет шэраг кніг, прысвечаных актуальным праблемам друку рэспублікі, яго гісторыі, вывучэнню ленінскай публіцыстычнай спадчыны і дзеячоў «ленінскага штаба журналістыкі», а таксама кіно- і радыёпубліцыстыкі, стылістыкі беларускай мовы.

Навуковая студэнцкая думка фарміруецца ў навуковых гуртках. Штогод на гарадскі агляд вылучаецца каля 20 работ, многім з якіх прысуджаюцца І і ІІ катэгорыі.

Шырока практыкуецца ў жыцці СНТ факультэта правядзенне навукова-тэарэтычных канферэнцый. З поспехам былі праведзены юбілейныя канферэнцыі, прысвечаныя публіцыстычнай дзейнасці А. В. Луначарскага, М. І. Калініна, А. М. Горкага, Д. І. Пісарава, І. С. Тургенева. Стала традыцыяй у красавіку праводзіць ленінскія навуковыя канферэнцыі, дзе падводзяцца вынікі работы за год.

Высокі навуковы і тэарэтычны ўзровень дакладаў даў магчымасць нашым студэнтам выступаць і ў іншых вну краіны. Удзельнікі нашага СНТ былі гасцямі Кішынёўскага, Ленінградскага універсітэтаў. Творчыя сувязі ўстаноўлены з СНТ Львоўскага універсітэта імя І. Франка, студэнты якога прымалі ўдзел у нашай канферэнцыі ў мінулым годзе. Карыснай традыцыяй СНТ становіцца выпуск альманаха «Творчасць журналіста».

Ідучы насустрач знамянальнай даце — 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна — калектыў выкладчыкаў факультэта журналістыкі і студэнты аддаюць усе сілы, каб падняць на новую ступень усю вучэбную, навуковую і выхаваўчую работу.

**Р. БУЛАЦКІ,**
**дэкан факультэта журналістыкі, дацэнт.**

*На здымку ўверсе наш фотакарэспандэнт А. Ласмінскі зазняў студэнтаў журфака за звычайным заняткам — падрыхтоўкай фотавітрыны.*

*Другі здымак зроблен на камсамольскім сходзе другога курса. Выступае сакратар камітэта камсамола журфака В. Гурын.*

*А вось увагу фотааматара В. Казлова прыцягнула новая на журфаку лабараторыя радыёвяшчання і тэлебачання (фота ўнізе злева).*

## 22 КРОПКІ НА КАРЦЕ

Мы на парозе выпуску. Ззаду чатыры гады вучобы, цаліна, песні ля начнога кастра ў саўгасе «Новыя Зелянкі» Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці у час уборкі бульбы.

Было гэта на першым курсе. І як не успомніць тут Данькіна. Сямiструнная гітара заўсёды паслухмянай была ў яго руках. Як зараз, стаяць перада мной, чытаючы вершы, Валерый Ігнаценка, цяпер студэнт Маскоўскага літаратурнага інстытута імя М. Горкага і Анатоль Ганчароў. Побач з імі бачу я нашых «мініятурышчыкаў» Л. Здановіча і В. Кавалёва, якія на кожным факультэцкім вечары дарылі ўсмешкі і ўзнімалі настрой.

А колькі песень пакінулі ў нашай памяці Іван Садоўскі і Людміла Карасёва! Гэта іх выклікалі на «біс» на сцэнах актавай залы БДУ і ў клубе ў далёкім казахстанскім стэпе.

На вялікі жаль, рэдка цяпер збіраемся мы дружнай сям'ёй, курсам. Многія з маіх аднакурснікаў ажаніліся. На мінулым тыдні адсяткавалі вяселле А. Паўлянкова, былога рэдактара насценнай газеты. Не, за гэта не трэба папракаць. Зараз усе мы сталі дарослымі, таму што вось-вось атрымаем сінія кніжкі дыпломаў.

Але пакуль... прыходжу ў свой інтэрнат і кідаю позірк на карту Беларускай ССР, якая вісіць на сцяне. На ёй сінім чарнілам нанесены малюсенькія кропкі—месцы будучай нашай работы. Іх 22.

**В. ОЗЕРАЎ,**
**студэнт 4-га курса факультэта журналістыкі.**

## ПАКУЛЬ ДРУГІМІ

**Дэбют эстраднага аркестра прызналі ўдалым. І гэта быў дэбют не толькі аркестра. Той вечар паклаў пачатак стварэнню на факультэце самадзейнасці, больш масавай і лепшай за папярэднюю.**

**У эстрадны ансамбль сталі прыходзіць новыя салісты, наладзіліся рэпетыцыі ў танцавальным калектыве, рабят з першага курса часта можна было бачыць з электрагітарамі.**

**Лепшая закалка для калектыву мастацкай самадзейнасці — выезд агітбрыгады. У гэтым годзе, у сакавіку, мы выступілі ў падшэфным саўгасе, на мініятурнай сцэне школьнай залы, у студэнцкім прафілакторыі.**

**Пры падрыхтоўцы да універсітэцкага агляду мы змаглі ліквідаваць многія недахопы і зрабілі праграму яркай і разнастайнай.**

**Спрэчка паміж факультэтамі, якая пачалася на сцэне, закончылася нарадай і тайным галасаваннем журы. Цяжка было вызначыць пераможцаў, бо ўсе факультэты выступілі намнога лепш, чым у мінулым годзе. Журфак заняў другое месца. Але гэтае другое аддзелена ад мінулагодняга чацвёртага касмічнай адлегласцю.**

**М. ІЛЬЮШЭНКА,**
**студэнт III курса журфака.**

**Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.**

АТ 08643 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Тыраж 2000 экз. Зак. 637.